УДК 9(476)

# Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў: утварэне і дзейнасць

Багдановіч А.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

БПС-Ф аформілася ў ліпені 1918 у выніку распаду Беларускай сацыялістычнай грамады. Аб'ядноўвала каля 2 тыс. прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, заможнага сялянства, служачых. Асноўнае ядро партыі складалі цэнтрысцкія элементы БСГ. Цэнтрызм быў уласцівы БПС-Ф і ў практычнай дзейнасці.

У першых праграмных дакументах ЦК БПС-Ф схіляўся да рэфармісцкага шляху будаўніцтва новага грамадства. На першым месцы ў дзейнасці партыі стаялі нацыянальнае і аграрнае пытанні. Яна фарміравалася як партыя парламенцкага тыпу і канцэнтравала сваю дзейнасць галоўным чынам у Радзе БНР.

5 студзеня 1919 БПС-Ф прыняла праграму, у якой была пацверджана прыхільнасць да сацыялітычнай арыентацыі. Праграма вызначала БПС-Ф як "партыю беларускую і сацыялістычную". Гэтым падкрэслівалася яе нацыянальная прыналежнасць і канчатковая мэта дзейнасці. У праграме было прызнана, што толькі новы – сацыялістычны – лад можа перадаць ва ўласнасць народа ўсю зямлю з яе багаццем, усе сродкі вытворчасці. БПС-Ф засталася вернай і ідэі федэралізму. У праграме адзначалася, што ў рамках сусветнай федэрацыі Беларуская дэмакратычная рэспубліка павінна стаць раўнапраўнай нацыянальна-дзяржаўнай адзінкай.

Такім чынам, у праграмных палажэннях БПС-Ф адлюстроўваўся ўтапізм партыі нацыянальнай дэмакратыі. Дактрына сацыялізму, сфармуляваная беларускімі сацыялістамі-федэралістамі, была ўтапічнай, і яе рэалізацыя не магла ажыццявіцца ў канкрэтных умовах Беларусі. Па сутнасці БПС-Ф з'яўлялася часткай палітычных сіл грамадскага руху, які знаходзіўся ў апазіцыі да бальшавікоў.

У пачатку 1921 БПС-Ф спыніла існаванне на тэрыторыі БССР. У Заходняй Беларусі асобныя яе групы дзейнічалі да сярэдзіны 1920-х гадоў.